## МАТЭРЫЯЛЫ КАМІСІІ ПРЫ ВІЛЕНСКІМ ГЕНЕРАЛ-ГУБЕРНАТАРЫ 1905 г. ЯК КРЫНІЦА ПА ПРАБЛЕМЕ ЎВЯДЗЕННЯ ЗЕМСТВАЎ У ЗАХОДНІХ ГУБЕРНЯХ

**С.А. Талмачова (г. Мінск, БДПУ, дацэнт)**

1 студзеня 1864 г. Аляксандр II падпісаў Палажэнне аб земскіх установах. Яго дзеянне было распаўсюджана на 34 губерні Еўрапейскай Расіі. Пры гэтым міністру ўнутраных спраў было даручана скласці меркаванні аб сродках і парадку прымянення азначанага закона на іншых тэрыторыях краіны, у тым ліку і ў 9 Заходніх губернях.

**У** адказ на запыт міністра ўнутраных спраў П.А.Валуева Віленскі генерал-губернатар М.М.Мураўёў адзначыў, што, на яго думку, "агульны выбарны парадак, пакладзены ў падмурак земскіх устаноў, паставіў бы ўсё гаспадарчае кіраванне ў залежнасць ад варожага нам, большай часткай, дваранства, дробнай шляхты і гарадского саслоўя польскага паходжання і рымска-каталіцкага



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

веравызнання і гэтым падпарадкавала б і сялянскае саслоўе іх уплыву, якое палякі ... выкарысталі для шкоды нашай..." Таму М.М.Мураўёў лічыў, што "земскія ўстановы не маглі яшчэ быць прыведзены ў дзеянне" ў заходніх губернях [1]. З гэтай прычыны Дзяржаўны савет прызнаў немагчымым увесці тут земскія ўстановы. Тлумачылася гэта тым, што хоць правы земстваў і былі даволі абмежаванымі, усё ж гэта быў адзіны ў Расіі дзяржаўны інстытут, які грунтаваўся на выбарным пачатку і ў некаторай ступені даваў магчымасць праявіцца грамадскай самадзейнасці. Механізм выбараў у земскія ўстановы быў абумоўлены маёмасным цэнзам і забяспечваў перавагу памеснага дваранства, што не адпавядала ўмовам заходніх губерняў, дзе царскі ўрад пасля паўстання 1863—1864 гг. праводзіў палітыку, накіраваную на эканамічны падрыў польскага землеўладання [2, с. 390].

У 1890 г. было прынята новае "Палажэнне", якое значна звузіла магчымасць земстваў вырашаць многія пытанні і паставіла земствы пад пільны кантроль мясцовых губернатараў. У пачатку XX ст. назіралася кансалідацыя земстваў у процістаянні з бескантрольнай бюракратыяй. Патрабаванні пераўтварэнняў у дзяржаўным кіраванні, стварэння прадстаўнічых інстытутаў, пашырэння паўнамоцтваў устаноў самакіравання выйшлі за межы сходаў і прагучалі з трыбуны агульназемскага форуму ў лістападзе 1904 г. [3, с. 5].

У адказ выйшаў указ ад 12 снежня 1904 г. "Аб прадвызначэннях да ўдасканалення дзяржаўнага парадку". Мікалай II адзначаў неабходнасць пераўтварэнняў у розных галінах грамадскага жыцця. У пункце 2 дакумента гаварылася аб неабходнасці даць земскім і гарадскім установам магчымасць шырокага ўдзелу і самастойнасць у адпаведнасці з заканадаўствам і заклікаць да ўдзелу ў гэтых установах прадстаўнікоў усяго мясцовага насельніцтва. Дзеля рэалізацыі гэтых палажэнняў адзначалася і неабходнасць стварэння дробных земскіх устаноў, акрамя ўжо існаваўшых губернскіх і павятовых [4, с. 5]. Гэтае палажэнне дало падставу многім лічыць, што ўрад згадзіўся з меркаваннем аб неабходнасці стварэння ўсесаслоўнага валаснога земства, аб якім разважалі як у земскіх, так і няземскіх губернях.

У адпаведнасці з указам ад 12 снежня 1904 г. пачалася распрацоўка праектаў рэформ. Рэвалюцыйныя падзеі студзеня 1905 г. паскорылі тэты працэс. Ва ўмовах рэвалюцыі неабходнасць у аб'яднанні і каардынацыі дзеянняў земскіх устаноў набыла канкрэтныя формы. 1905 г. стаў рэкордным за ўсю гісторыю існавання земстваў па колькасці з'ездаў. З лютага па лістапад адбылося 5 агульназемскіх з'ездаў [5, с. 20]. Прэм'ер-міністр С.Ю.Вітэ быў згодзен ісці на кампраміс з грамадскімі дзеячамі. Новы старшыня Савета Міністраў П.А.Сталыпін лічыў дапушчальным у пэўнай ступені пашырэнне кампетэнцыі земскіх устаноў, а таксама распаўсюджанне мясцовага самакіравання на заходнія губерні, удасканаленне земскай сістэмы. 18 лютага 1905 г. быў абвешчаны царскі рэскрыпт на імя міністра ўнутраных спраў А.Г.Булыгіна аб усталяванні Асобай нарады для распрацоўкі праекта дзяржаўных пераўтварэнняў. У гэтым рэчышчы

палажэння 1890 г. і пажадае "земства зусім новага, пабудаванага на іншым, больш шырокім падмурку, то, магчыма, пройдуць многія гады, перш чым краю будзе дано хоць якое-небудзь земства" [6, с. 14]. Нягледзячы на гэтую заўвагу, пасля доўгіх абмеркаванняў і дэбатаў члены камісіі аднагалосна прынялі па першаму другому пытанням праграмы Міністэрства ўнутраных спраў наступную рэзалюцыю: "Нарада, адмаўляючы магчымасць увядзення ў губернях Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай земскага палажэння 1903 г. і прызнаючы ўвядзенне палажэння 1890 г. без змяненняў непажаданым, лічыць неабходным больш хуткае ўвядзенне ў названых губернях земскіх устаноў на падставах, узгодненных з мясцовымі асаблівасцямі края" [6, с. 15].

Упартыя дэбаты працягваліся і па пытанні аб прадстаўніцтве ў земстве ад насельніцтва. Так, выбарны ад дваран Ковенскай губерні К.А.Завіша, адзначыў, што саслоўнасць не можа быць галоўным прынцыпам земскай справы і прапанаваў у якасці асновы ўладкавання земскіх устаноў зрабіць прынцып справядлівасці: "Дзе ёсць абавязак, там павінна быць і права; хто сплочвае падаткі, той павінен мець права і распараджацца імі і кантраляваць іх ужыванне". 3 гэтага К.А.Завіша зрабіў выснову, што кожная група насельніцтва павінна ўдзельнічаць у земстве прапарцыянальна суме сплочаных земскік збораў. У прыватнасці ён адзначаў: "...сялянскае саслоўе ў сваёй сукупнасці валодае вельмі значнай колькасцю зямельнай маёмасці і адпаведна гэтаму будзе ўдзельнічаць сплочванні земскіх збораў; па эканамічных умовах выплата гэта будзе для сялян асабліва цяжкай. 3 гэтай прычыны прадстаўніцтва яго ў земстве павінна выражацца дастаткова яскрава і не можа быць пазбаўлена самастойнасці. Адсюль, дзеля аднаўлення самастойнасці сялянскага прадстаўніцтва і забеспячэння жыццяздольнасці будучых земскіх устаноў, неабходна скасаваць усталяваны палажэннем 1890 г. парадак зацвярджэння адміністратыўнай уладай кандыдатаў у галосныя, якія выбіраліся з сялян". Акрамя таго, на думку К.А.Завішы, сялянам неабходна было даць магчымасць выбіраць сваіх прадстаўнікоў у земствы толькі з сялян, але і з іншых саслоўяў [6, с. 17].

Апошняе сцвярджэнне выклікала супярэчлівыя меркаванні ўдзельнікаў Нарады. Адны лічылі такі парадак слушным, іншыя выказвалі боязь, што на сялян змогуць аказваць уціск дваране ці чыноўнікі [6, с. 17-20]. Прадстаўнікі з сялян запрошаныя генерал-губернатарам, выказаліся за прадстаўленне права сялянам выбіраць прадстаўнікоў у земствы толькі з асоб свайго саслоўя, акрамя адной акалічнасці - даць магчымасць сялянам выбіраць сваімі прадстаўнікамі таксама асоб з вышэйшай адукацыяй ці тых, якія знаходзяцца на дзяржаўнай службе, калі яны выйшлі з сялян [6, с. 18]. У выніку большасцю была прынята наступная рэзалюцыя: "1) прадстаўніцтва сялян у земскіх установах губерняў Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай павінна быць прапарцыянальным іх землеўладанню; 2) ...прызнаць у губернях Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай пажаданым прадстаўленне сялянам права абіраць сваімі прадстаўнікамі ў земскія ўстановы таксама асоб з іншых саслоўяў, якія маюць цэнз; ...3) прызнаць непажаданым



уключэнне, у справе земскага прадстаўніцтва, у разрад сялян-уладальнікаў надзельнай зямлі таксама ўсіх, без адрознення саслоўяў, асоб, якія валодаюць дробнымі зямельнымі адзінкамі па-за рысай надзелаў" [6, с. 20-21]. Такім чынам, прапановы Нарады аб земскім уладкаванні ў заходніх губернях істотна адрозніваліся ад Палажэння 1890 г, на падставе якога дзейнічалі земствы ва ўнутраных губернях. 3 падобнымі меркаваннямі ўрад не мог пагадзіцца.

Не менш гарачыя дэбаты ўзбудзіла абмеркаванне пятага пытання праграмы Міністэрства ўнутраных спраў: "Ці трэба дапусціць у земскім прадстаўніцтве ўдзел яўрэеў?" Па Палажэнні 1890 г. яўрэі не дапускаліся да ўдзелу ў земствах. Аднак заходнія губерні ўваходзілі ў "рысу яўрэйскай аседласці", і з гэтай прычыны яўрэйскае насельніцтва было тут шматлікім.

Выбарны ад дваран Віленскай губерні М.Г.Хелхоўскі нагадваў, што ў складзе гарадскога насельніцтва краю налічвалася да 600 тыс. яўрэеў, а ў асобных населеных пунктах яны складалі ад 48 да 60% жыхароў, і іх маёмасць абкладалася земскім зборам. М.Г.Хелхоўскі адзначаў неабходнасць справядлівасці - "кожны плацельшчык земскіх збораў павінен разам з тым карыстацца правам удзелу ў вырашэнні земскіх спраў". Акрамя таго, істотным было і тое, што яўрэям належала значная частка гандлёва-прамысловых устаноў, амаль увесь дробны гандаль знаходзіўся ў іх руках. Зыходзячы з гэтых аргументаў, М.Г.Хелхоўскі прапаноўваў: "Не ў інтарэсах края пакідаць такі элемент па-за грамадскімі справамі. Яўрэі нададуць земскай гаспадарцы ўласцівы ім практычны сэнс і вопыт, а таму іх трэба дапусціць да ўдзелу ў земстве на роўных для ўсіх падставах" [6, с. 24].

3 гэтымі аргументамі не ўсе пагаджаліся. У прыватнасці, Лідскі павятовы прадвадзіцель дваранства І.Р.Фон-Вітт лічыў, што "яўрэйства гістарычна заўсёды было варожа хрысціянству", і ў земстве прадстаўніцтва яўрэеў "будзе небяспечным злом" [6, с. 25]. Аднак такая пазіцыя мела мала прыхільнікаў. Ковенскі губернскі прадвадзіцель дваранства А.А.Мілер нагадаў, што яўрэі былі ўжо "дапушчаны ў склад Дзяржаўнай Думы, ...[і таму] няма падстаў не дапускаць іх да земскага прадстаўніцтва, якое займаецца толькі гаспадарчымі патрэбамі мясцовага насельніцтва" [6, с. 25]. У выніку большасць членаў нарады (48 супраць 7) прыняла рэзалюцыю: прызнаць пажаданым удзел яўрэеў у земскіх выбарах і прадстаўніцтве [6, с. 26].

У адпаведнасці з Палажэннем 1890 г. асобы духоўнага звання былі выдалены з ліку ўдзельнікаў выбараў, насуперак нормам 1864 г. Аднак з 1890 г. палітычныя абставіны змяніліся. Указ ад 12 снежня 1904 г. і як вынік яго рэалізацыі - зацверджанае Мікалаем II Палажэнне Камітэта Міністраў 11 лютага 1905 г. "Аб парадку выканання пункта шостага імяннога указа ад 12 снежня 1904 г." [7], а таксама ўказ ад 17 красавка 1905 г. "Аб умацаванні пачаткаў верацярплівасці" [8] прывялі да неабходнасці пастаноўкі пытання аб пажаданасці прадстаўлення ў земстве выбарчага права духавенству. Брэсцкі павятовы прадвадзіцель дваранства \А.П..Чычэрын адзначыў, што духавенства заходніх губерняў значна адрознівалася



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адтаго, якое "было ўспячцы" ва ўнутраных губернях. Тут яно ў'яўляла "вялікую культурную сілу", бо скрупулёзна падбіралася. І праваслаўнае, і каталіцкае духавенства складалася галоўным чынам з асоб з сярэдняй і вышэйшай адукацыяй, было "гістарычна звязана з народам, блізкім да яго". І нельга, на думку А.П.Чычэрына, выдаляць з земства "такі ўплывовы элемент" [6, с. 31].

У гэтым жа кірунку выступаў і Новааляксандраўскі павятовы прадвадзіцель дваранства Р.Б.Пяткевіч, які лічыў пажаданым удзел духавенства ў рабоце земства, таму што ўздзеянне духавенства з'яўлялася ў той час вельмі важным, "асабліва з-за сучаснага хістання розуму і сацыял-дэмакратычных уплываў" [6, с. 31]. Аднак большасць членаў Нарады палічыла непажаданым удзел асоб духоўнага звання ў земскіх выбарах і земскім прадстаўніцтве. Але ў тым выпадку, калі гэтыя асобы валодалі маёмасцю і адпавядалі патрабаванням цэнзу, яны маглі праз павераных прымаць удзел у выбарным земскім прадстаўніцтве на агульных умовах. Маёмасныя інтарэсы цэркваў як землеўладальнікаў таксама маглі быць прадстаўлены дэпутатамі, прызначанымі духоўным начальствам [6, с. 32].

Такім чынам, камісія стаяла на пазіцыях абароны гаспадарчых інтарэсаў усяго насельніцтва, якое пражывала на тэрыторыі Заходняга краю, незалежна ад саслоўя і веравызнання. Акрамя названых пытанняў, на пасяджэннях абмяркоўвалася і ўсталяванне памераў маёмаснага цэнзу для выбараў у земства, і межы паўнамоцтваў земстваў у гаспадарча-эканамічным уладкаванні школьнай, медыцынскай, ветэрынарнай, харчовай спраў і г.д. Аднак тыя меркаванні, якія выказвалі члены Нарады, не адпавядалі ўрадавым уяўленням аб земстве. Рэзалюцыя, прынятая ўжо па першым і другім пытаннях праграмы Міністэрства ўнутраных спраў, рабіла далейшую работу камісіі бесперспектыўнай, таму што падобныя высновы не адпавядалі інтарэсам цэнтральнай улады. Акрамя таго, такі апазіцыйны настрой дваранства заходніх губерняў яшчэ раз пераканаў урад у адтэрміноўцы правядзення земскай рэформы ў краі. З гэтай прычыны змяненні ў існаваўшае палажэнне, якія прапаноўваліся, так і не былі рэалізаваны, але высветлілі пазіцыю розных саслоўяў насельніцтва заходніх губерняў.

**Крыніцы і літаратура**


1. Дело о преобразовании учреждений, ведающих дела земского хозяйства в губерниях Архангельской, Астраханской, Виленской, Витебской, Волынской, Гродненской, Киевской, Ковенской, Минской, Могилевской, Оренбургской, Подольской и Ставропольской // Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у Санкт-Пецярбургу. - Фонд П49.-Воп. 13, 1901 г.-Спр. 183.-Арк. 1.
2. Яноўская, В. Усталяванне палітычнай рэакцыі. Барацьба "заходнерускіх" і польскіх нацыяналістычных груповак з беларускім нацыянальным рухам. Увядзенне земстваў / В. Яноўская // Пісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII - пачатак XX ст) / М.Біч, В.Яноўская, С.Рудовіч і інш.; рэдкал.: М.Касцюк (гал. рэд.) і інш. - Мінск: Экаперспектыва, 2005. - 519 с; іл.
3. Земское самоуправление в России, 1864-1918: в 2 кн. / Н.Г.Королева (отв. ред.); Ин-т рос. истории РАН. - Кн. 2: 1905-1918. - М.: Наука, 2005. - 384 с.





4. Именной Высочайший Указ Правительствующему Сенату о предначертаниях к усовершенствованию государственного порядка // Журналы Комитета Министров по исполнению указа 12 декабря 1904 г. / Издание Канцелярии Комитета Министров. - СПб.: Государственная типография, 1905. - 522 с.
5. Королева, Н.Г. Революция 1905-1907 годов и политическая деятельность земств / Н.Г.Королева // Земское самоуправление в России, 1864-1918: в 2 кн. / Н.Г. Королева (отв. ред.); Ин-т рос. истории РАН. - Кн. 2: 1905-1918. - М.: Наука, 2005. - 384 с.
6. Журналы заседаний Комиссии при Виленском Генерал-губернаторе 1905 года О введении земства в Виленской, Ковенской и Гродненской губерниях. - СПб.: Тип-я А. Смолинского, 1913. - 47 с.
7. Высочайше утвержденное положение Комитета Министров 11 февраля 1905 г. «О порядке выполнения пункта шестого Именного Высочайшего указа от 12 декабря 1904 г.» // Полное собрание законов Российской империи. Собр. 3-е. - Т. XXV. - Отд. I. - № 25815.
8 Именной Высочайший указ, данный Сенату 17 апреля 1905 г. «Об укреплении начал веротерпимости» // Полное собрание законов Российской империи. Собр. 3-е. - Т. XXV. - Отд. I. - № 26125.




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ